Заданні абласной віктарыны па жыцці і творчасці І.Шамякіна

*Паважаныя ўдзельнікі віктарыны! Выберыце і адзначце правільны варыянт адказу.*

---

Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка, час выканання задання

1. Іван Пятровіч Шамякін нарадзіўся:
а) 8 лютага 1921 года ў вёсцы Глінішчы Хойніцкага раёна;
б) 30 студзеня 1921 года ў вёсцы Карма Добрушскага раёна;
в) 12 лістапада 1920 года ў в. Борхаў Рагачоўскага раёна.

2. Знайдзіце агульнае ў дзяцінстве Івана Шамякіна і Якуба Коласа:
а) бацька быў леснікам і дзяцінства прайшло сярод прыроднага свету;
б) першую адукацыю атрымаў ад вясковага хлопчыка-настаўніка – дарэктара;
в) нарадзіўся ў мнагадзетнай сям'і.

3. Якія мясціны звязаны з жыццёвай і творчай біграфіяй Івана Пятровіча Шамякіна?
а) Глінішчы, Алексічы, Хойнікі, Мінск;
б) Мурманск, Пракопаўка, Цяруха, Мінск;
в) Бычкі, Сумы, Гродна, Мінск.

4. Укажыце першае апавяданне Івана Пятровіча Шамякіна, апублікаванае ў 1944 годзе:
а) “Сваякі”;
б) “У снежнай пустыні”;
в) “На Чорных лядах”.

5. З якога твора, па прызнанні самога Івана Шамякіна, пачалася яго сур'ёзная літаратурная дзейнасць?
а) апавяданне “У завіруху”;
б) аповесць “Помста”;
в) раман “Крыніцы”.

6. Якім з пералічаных твораў Іван Пятровіч Шамякін адкрыў тэму партызанскай барацьбы ў беларускай літаратуры?
а) “Снежныя зімы”;
б) “Глыбокая плынь”;
в) “Сэрца на далоні”.

7. Калі была створана пенталогія І. Шамякіна “Трывожнае шчасце”?
а) 1956–1963;
б) 1948–1955;
в) 1971–1976.

8. Які перыяд з жыцця І.П. Шамякіна стаў асновай для стварэння аўтабіяграфічнай аповесці “Агонь і снег” з пенталогіі “Трывожнае шчасце”?
а) служба пісьменніка на Карпатах падчас Вялікай Айчыннай вайны;
б) служба ў зенітна-артылерыйскай часці пад Мурманскам падчас Вялікай Айчыннай вайны;
в) раненне пісьменніка на полі бою.

9. Жонка пісьменніка Марыя Філатаўна Кротава была пратытыпам вобраза:
а) Зосі Савіч з рамана “Сэрца на далоні”;
б) Сашы Траянавай з пенталогіі “Трывожнае шчасце”;
в) Вольгі Ляновіч з аповесці “Гандлярка і паэт”.

10. Укажыце галоўных герояў аповесці Івана Шамякіна “Непаўторная вясна” з пенталогіі “Трывожнае шчасце”:
а) Васіль Дзяцел і Ганна Чарнушка;
б) Пятро Шапятовіч і Саша Траянава;
в) доктар Яраш і Зося Савіч.

11. Які з твораў І.П. Шамякіна распавядае пра змаганне мінскага падполля супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў?
а) “Глыбокая плынь”;
б) “Атланты і карыятыды”;
в) “Сэрца на далоні”.

12. Укажыце твор І.П. Шамякіна, які мае аўтабіяграфічную аснову:
а) пенталогія “Трывожнае шчасце”;
б) раман “Вазьму твой боль”;
в) раман “Снежныя зімы”.

13. Які з герояў Івана Пятровіча Шамякіна ў дзяцінстве перажыў вялікую трагедыю: на яго вачах паліцаі забілі маці і маленькую сястрычку?
а) доктар Яраш;
б) Іван Батрак;
в) Максім Карнач.

14. Пазнайце героя па партрэтнай характарыстыцы: “… Асілкавая постаць, што ўся імкнецца ў неба за галубамі, дужыя голыя рукі, шырокі і мужны твар, валасы каштанавага колеру”:
а) Пятро Шапятовіч з пенталогіі “Трывожнае шчасце”;
б) Максім Карнач з рамана “Атланты і карыятыды”;
в) доктар Яраш з рамана “Сэрца на далоні”.

15. Які працэс Галіна Адамаўна, жонка доктара Яраша, галоўнага героя рамана І. Шамякіна “Сэрца на далоні”, лічыла “хітрым механізмам, які павінен быць заўсёды схаваным і разам з тым ні на міг не спыняцца, не грымець, не ляскаць, не дыміць, не чадзіць, але працаваць безадказна”?
а) прасаванне адзення;
б) чалавечыя ўзаемаадносіны;
в) выхаванне.

16. Які дар адкрыўся ў доктара Яраша з узростам?
а) маляванне;
б) скульптарскія здольнасці;
в) нечаканыя адкрыцці прыгожага?

17. Як найбольш любіў адпачываць доктар Яраш з рамана І. Шамякіна “Сэрца на далоні”?
а) працаваць на дачы;
б) галубятніцтва;
в) размаўляць з роднымі.

18. Узнавіце фразу з рамана І. Шамякіна “Сэрца на далоні”: “У яго былі надзвычай чуткія ............., паталагічна чуткія, нават уласныя эмоцыі ён перш за ўсё адчуваў .............. Вось так заколе – значыцца, злосць, радасць, здзіўленне”:
а) рукі, рукамі;
б) пальцы, пальцамі;
в) валасы, валасамі.

19. Як Зося Савіч спрабавала збіць з панталыку нямецкіх аўчарак, каб уратаваць доктара Яраша?
а) заблытала яго сляды;
б) выпусціла на вуліцу кошку;
в) выпусціла з клеткі трусоў.

20. Укажыце падпольныя мянушкі доктара Яраша з рамана “Сэрца на далоні”:
а) Яська – гаспадар з-пад Вільні, Хамуціус;
б) Кузьма Клешч, Віктар;
в) Васіль, Іван.

21. З кім параўноўваў журналіст Шыковіч з рамана “Сэрца на далоні” доктара Яраша падчас аперацыі на сэрцы?
а) з майстрам;
б) з чараўніком;
в) са звышчалавекам, з богам.

22. Адчуванні якога з персанажаў рамана “Сэрца на далоні” і ў сувязі з чым апісаны наступным чынам: “Адчуванні можна было б параўнаць з адчуваннем таго шахцёра, якога, не па яго волі, спусцілі ў глыбокую шахту, завалілі і пратрымалі там у цемры доўга-доўга. А потым другія людзі, добрыя, адкапалі і паволі падымаюць наверх. І вось гэты міг, калі ён павінен ступіць на паверхню зямлі, убачыць неба і сонца, – самы страшны. Не аслепнуць бы!”?
а) доктар Яраша пасля нечаканага выратавання ад гестапаўцаў;
б) журналіста Шыковіча пасля публікацыі артыкула;
в) Зосі Савіч пасля аперацыі на сэрцы.

23. Хто з’яўляецца прататыпам жонкі Івана Батрака Таісы Міхайлаўны з рамана І. Шамякіна “Вазьму твой боль”?
а) дачка пісьменніка Таццяна Іванаўна Шамякіна;
б) жонка пісьменніка Марыя Філатаўна;
в) маці пісьменніка Санклеція Сцяпанаўна.

24. Чаму мінулае і сёлетняе жніво для Івана Батрака, галоўнага героя рамана “Вазьму твой боль”, было святам?
а) любіў працаваць на камбайне;
б) любаваўся спелым жытам;
в) падрос сын Карней, навучыўся вадзіць і камбайн, і грузавік.

25. Якую работу Таіса Міхайлаўна, жонка Івана Батрака, прыраўняла да ўборкі жніва па ступені адказнасці і важнасці?
а) працу медсястры;
б) навучанне і выхаванне дзяцей;
в) памагчы нарадзіцца чалавеку.

26. Пазнайце персанаж з рамана “Вазьму твой боль” па партрэтнай характарыстыцы: “... Шырокі вуглаваты лоб, з-пад клятчастай кепкі не відно валасоў... Вочы, як бы хітра прыжмураныя, але праніклівыя, нядобра калючыя...”:
а) Іван Батрак;
б) брыгадзір Астаповіч;
в) паліцай Шышка.
27. У якім творы Івана Шамякіна апавядаецца пра аварыю на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі і яе вынікі для насельніцтва палескага рэгіёна?
а) “Палеская мадонна”;

б) “Сатанінскі тур”;
в) “Злая зорка”.

28. Пра каго з рамана “Вазьму твой боль” ідзе гаворка: “... Жыла, як крот, – увесь час у зямлі, на сонца баялася глянуць, ні разу не папрасіла лягчэйшую, чым у полі на бураках да на бульбе, работу. У пяцьдзесят сем гадоў – бабуся, зморшчаная, што печаны яблык...”?
а) пра Зосю Савіч;
б) пра жонку паліцая Шышковіча;
в) пра Сашу Траянаву.

29. Як імкнуўся пераадолець доўгую дарогу, не заснуўшы, Іван Батрак?
а) у гаворках з тымі людзьмі, якіх падвозіў;
б) спяваў народныя песні;
в) думаў пра сваё жыццё.

30. Хто альбо што ў залежнасці ад сітуацыі параўноўваецца Іванам Шамякіным то з дзяўчынай на абцасіках па кладцы, то з напоеным стаеннікам?
а) жонка Таіса Міхайлаўна;
б) машына, на якой працаваў Іван Батрак;
в) навакольная прырода.

31. Хто і ў якой сітуацыі перажывае падобны стан: “Колькі ні мыла рукі... спіртам мыла – не адмыла. Напэўна, праз гэта не хацелася ні да чаго дакрануцца тут, у сваім доме...”?
а) Зося Савіч пасля сустрэчы з гестапаўцамі;
б) Таіса Міхайлаўна пасля таго, як зрабіла ўкол былому паліцаю Шышковічу;
в) Саша Траянава пасля таго, як у яе хату прыйшлі немцы.

32. Які твор І.П. Шамякіна прысвечаны асэнсаванню праблемы “жанчына і вайна”?
а) раман “Слаўся, Марыя!”;
б) раман “Палеская мадонна”;
в) аповесць “Гандлярка і паэт”.

33. Які з пералічаных твораў І.П. Шамякіна быў экранізаваны?
а) “Палеская мадонна”;
б) “Сатанінскі тур”;
в) “Вазьму твой боль”.

34. Да якой тэмы І. Шамякін звяртаўся ў кожным сваім буйным творы?
а) узаемаадносінаў чалавека і прыроды;
б) выхавання маладога пакалення;
в) жыцця і смерці.

35. Які твор з пералічаных не належыць І.П. Шамякіну?
а) “Падзенне”;
б) “Зеніт”;
в) “Мёртвым не баліць”.